**191.** Знайдзіце пары назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

*змрок* *дверь* *клопат* *поведение*
*чарніла* *хлопоты* *сумерки* *пригоршня*
*прыгаршчы* *паводзіны* *дзверы* *чернила*

Складзіце са словамі словазлучэнні і запішыце іх парамі. Вызначце лік назоўнікаў. Ці супадае лік назоўнікаў у беларускай і рускай мовах?

Падрыхтуйце паведамленне ў навуковым стылі на тэму «Лік назоўнікаў». Падумайце, колькі частак будзе ўключаць навуковы тэкст. Сцісла сфармулюйце асноўную думку кожнай часткі. У пачатку кожнай часткі выкарыстоўвайце словы *па-першае, па-другое, па-трэцяе*... Выступіце з паведамленнем перад класам.

**192.** Прачытайце тэкст. Спішыце, паставіўшы назоўнікі, што ў дужках, у форму множнага ліку і патрэбнага склону. Абазначце канчаткі назоўнікаў.

Як *(падручнік)* і *(сшытак)* прыйшлі да нас на парту? Шлях іх доўгі і складаны.

Паперу робяць з дрэва. *(Дрэва)* вырошчваюць, даглядаюць, зберагаюць ад шкоднікаў лесу. Колькі сілы і намаганняў трэба прыкласці! А яшчэ ўлічыць прыродныя *(фактар)* — ападкі, тэмпературу. Далей *(дрэва)* зразаюць, распілоўваюць, апрацоўваюць. Паперу выпрацоўваюць з драўніны. Праца людзей розных *(прафесія)* стаіць за кожным аркушам паперы. Як дорага такая праца абыходзіцца дзяржаве! Але як лёгка дастаецца гэта нам, *(вучань)*.

Выпішыце па адным прыкладзе назоўнікаў, якія маюць форму толькі множнага ці форму толькі адзіночнага ліку.

Што вы ведаеце пра акцыю «Здай макулатуру — выратуй дрэва!»? Раскажыце, як вучні вашага класа прымаюць удзел у такой акцыі.

## § 30. Патрабаванні да сціслага пераказу

**!** Сціслы пераказ коратка і абагульнена перадае змест прапанаванага тэксту. Каб зрабіць сціслы пераказ тэксту, трэба выдзеліць галоўнае, скараціць тэкст (змест абзаца, дыялогу

перадаць адным-двума сказамі), знайсці і выкарыстаць моўныя сродкі для абагульненай перадачы зместу. Затым узнавіць тэкст, захоўваючы яго кампазіцыю і моўныя асаблівасці.

**193.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак. Растлумачце лексічнае значэнне выдзеленых слоў.

Толя і Коля паехалі на выстаўку сабак. Выстаўка толькі пачыналася. Людзі з сабакамі крыху **памітусіліся** і пачалі выстройвацца радамі. Расчэсвалі іх, папраўлялі нагруднікі з медалямі. Хлопцы не дачакаліся, пакуль усе падрыхтуюцца, пайшлі глядзець выстаўку.

Спачатку стаялі і сядзелі сабакі-веліканы. Усе хадзілі каля іх і чыталі надпісы. Хорт — сабака высокі, худы, ногі доўгія. Дог — сабака-велікан. Страшна падступіцца да яго. Убачылі і баксёра. Галава вялікая, нос нібы ўціснуўся ў яе. Ад гэтага ў яго **зморшчын*** і складак многа на лбе, каля носа. Аўчарка ўсходнееўрапейская вельмі прыгожая. Вочы ў яе разумныя-разумныя. Сенбернар — вялікі і тлусты **здаравяка**. Аўчарка колі — прыгажуня, спакойная і **лагодная***. Былі тут і эрдэльтэр'ер, фокстэр'ер, японскі чын, чыхуахуа.

Але самае цікавае было наперадзе. Сабакі пачалі паказваць, што яны ўмеюць: хадзілі па крузе, бегалі па бервяне, пераскоквалі цераз сценку, лазілі па лесвіцах, поўзалі на жываце, «вартавалі». **Гледачы** назіралі і дзівіліся, а журы ацэньвала. Хлопчыкаў увесь час хвалявала думка, хто з сабак атрымае самы прыгожы медаль *(Паводле П. Місько)*.

Да якога стылю і тыпу маўлення адносіцца тэкст? Вызначце яго тэму і асноўную думку.

На колькі частак можна падзяліць тэкст?

Пры дапамозе якіх моўных сродкаў аўтар расказаў пра асноўную падзею — паход на выстаўку сабак? Якую ролю ў тэксце адыгрываюць назоўнікі?

Складзіце план тэксту. Якія пункты можна апусціць, каб перадаць асноўную інфармацыю пра паход на выстаўку сабак?

Змест абзаца, у якім апісваюцца сабакі, перадайце некалькімі сказамі з аднароднымі членамі. Пастарайцеся, каб асноўнай інфармацыяй сталі звесткі пра тое, як праходзіла выстаўка, а не апісанне сабак.

Зрабіце сціслы пераказ тэксту (вусна).



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**ПАМЯТКА**

**Як зрабіць сціслы пераказ**

1. Прачытайце тэкст, высветліце значэнне незразумелых слоў.
2. Вызначце тэму і падтэмы, асноўную думку тэксту, яго стыль і тып маўлення.
3. Знайдзіце галоўнае і другараднае ў тэксце (галоўная інфармацыя вылучаецца з улікам мэты выказвання).
4. Вызначце, якая інфармацыя сціскаецца спосабам пропуску матэрыялу, а якая — спосабам абагульнення (падобныя дзеянні, прыметы, прадметы назваць, калі гэта магчыма, адным словам; змест абзаца, дыялогу перадаць адным-двума сказамі).
5. Помніце, што задача пераказу — сцісла, коратка ў адпаведнасці з асноўнай думкай перадаць змест тэксту, захоўваючы пры гэтым моўныя сродкі, апорныя словы і выразы.
6. Складзіце план пераказу (колькасць пунктаў плана можа быць меншай, чым колькасць падтэм у тэксце).

**194.** Уважліва прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак. Растлумачце лексічнае значэнне выдзеленых слоў.

Дзядуля расказаў мне такую гісторыю.

Ішоў хлопчык у суседнюю вёску да **радні** ў госці. Дарога была няблізкая, незнаёмая. Вечар **заспеў** яго ў дарозе, пачало цямнець. А тут яшчэ дагнаў яго сабака, стары, худы, поўсць лапікамі. Жывы да жывога цягнецца, вось і сабака прыстаў да хлопчыка. Ідзе за ім, галоднымі вачамі есці просіць.

Зусім сцямнела. Дарога нырнула ў лес, звузілася, завіляла, закруцілася ў **гушчары**. А ў лесе цямней, чым у полі. І хлопчык заблудзіўся. Дарога павярнула ў адзін бок, а ён — у другі.

Ідзе хлопец, а сабака за ім **трушком** бяжыць, не адстае. Але вось сабака абагнаў хлопчыка і стаў на яго шляху.

— Ты што? — напалохаўся хлопчык, замахнуўся на яго, але сабака не адступіў.

Паспрабаваў абысці сабаку, але той усякі раз станавіўся перад ім. І здагадаўся нарэшце хлопчык, што сабака засцерагае яго ад нейкай **небяспекі**. Спыніўся, прыгледзеўся і ўбачыў наперадзе, за высокай травой, **абрыў**. А ў глыбіні блішчала вада

і бялелі вялікія камяні. Гэта ж якая бяда чакала хлопца, калі б не ўратаваў сабака! Дастаў хлопец **акраец** хлеба, падзяліў яго папалам — сабаку і сабе.

— Даруй, што я праганяў цябе, хлеба пашкадаваў.

А потым прывёў сабаку ў свой двор і да самай яго смерці карміў і даглядаў.

Вось такая гісторыя. Засталося толькі дадаць, што гэтым хлопчыкам быў мой дзед *(Паводле В. Хомчанкі)*.

Да якога стылю і тыпу маўлення адносіцца тэкст? Знайдзіце ў тэксце дзеясловы, ужытыя ў пераносным значэнні. Якія яшчэ сродкі стылістычнай выразнасці ўжываюцца аўтарам тэксту?

Карыстаючыся памяткай, сцісла перакажыце частку тэксту пра тое, як сабака засцярог хлопчыка ад небяспекі.

## § 31. Склон назоўнікаў. Асновы назоўнікаў

**195.** Прачытайце тэкст.

Калі слова ўжываецца ў пачатковай форме — у назоўным склоне адзіночнага ліку, — яно толькі называе прадмет, з'яву прыроды, расліну ці жывёлу. Але паміж людзьмі, прадметамі, з'явамі прыроды, раслінным і жывёльным светам існуюць разнастайныя і складаныя адносіны: прасторавыя, часавыя, умовы, мэты ці прычыны. Паглядзіце навокал, звярніце ўвагу на прадметы, якія знаходзяцца вакол вас: сцяна, парта, стол, падручнік, сшытак і інш. Называючы іх, мы толькі даём ім імёны, а ў якіх адносінах яны знаходзяцца адно з адным, нам не зразумела. І толькі з дапамогай розных склонавых форм, якія звязваюць словы, мы можам устанавіць іх узаемазалежнасць: **У класе стаяць парты. За партамі сядзяць вучні.** Граматыка ўстанавіла правілы сувязі слоў і арганізавала словы ў сказах. Гэта сувязь выражаецца пры дапамозе змянення слоў па склонах *(Паводле В. Івановай)*.

Якое значэнне выражаецца ў слове, калі яно ўжываецца ў пачатковай форме? З дапамогай якіх відаў сувязі словы звязваюцца ў сказах?

Які раздзел моваведства ўстанаўлівае правілы сувязі слоў у сказах?

Колькі склонаў у беларускай мове? Як вызначыць склон назоўніка? Вызначце склон назоўнікаў у выдзеленых сказах.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі